**Сутула, Г.** Міратворац / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 28 студз. — С. 4.

## МІРАТВОРАЦ



Вёску Старое Зашчэсле на карце Глыбоччыны сёння не знойдзеш. А ў шасцідзесятых гадах мінулага стагоддзя ў ёй, размешчанай «на кулічках» раёна – воддаль ад бойкіх гасцінцаў, у памежжы з суседняй Круляўшчызнай, – бруіла жыццё. Вяскоўцы з калгаса імя Свярдлова, у склад якога ўваходзіла вёска, аралі і сеялі, будаваліся і спраўлялі наваселлі, жаніліся і нараджалі дзяцей, вучылі іх і адпраўлялі ў самастойны шлях.

Гэтыя зацішныя мясціны ажывалі штогод пад восень, калі адусюль з'язджаліся ягаднікі: побач з вёскай на дзесяткі вёрст рассцілалася багатае брусніцамі і журавінамі балота.

І рэчка тут была свая. Зашчаслянка, вядома ж, не Заходняя Дзвіна, але і рыбу павудзіць было дзе і ў спёку апаласнуцца.

Няўмольны час сцёр з карты Глыбоччыны назву вёскі, але яна засталася ў памяці старажылаў ды ў метрыках тых, хто тут нарадзіўся.

Старое Зашчэсле. Ураджайнае. Ціхі ўтульны куточак, да якога хінулася душа, стала малой радзімай Паўла Кірылавіча Макатуна. Ён тут нарадзіўся і вырас. Паспытаўшы жыццё на смак, з далёкіх дарог вяртаўся сюды, нібы ў рай.

### Хто мазоль носіць, той хлеба не просіць

У сям'і Кірыла Пятровіча і Леаніды Антонаўны Макатуноў з Ураджайнага падрасталі тры сыны і дачка. Бацька працаваў трактарыстам, маці – малаказборшчыцай. Калі яны прыходзілі з работы, у доме пахла саляркай, перамешанай са свежым сырадоем. Спецыфічны, але такі знаёма-прыемны пах асацыіраваўся ў Паўліка з пахам сялянскай працы, да якой бацькі змалку прывучалі дзяцей.

Калі хлопец падрос, стаў першым бацькавым памочнікам і так хацеў хутчэй сесці за руль трактара!

Скончыў Ураджайнаўскую васьмігодку. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Падсвільскай СШ. Пасля школы, на радасць бацькоў, застаўся ў калгасе.

Правы трактарыста, якія атрымаў разам з атэстатам аб заканчэнні дзесяцігодкі, спатрэбіліся. Працавіты быў хлопец, да тэхнікі адносіўся беражліва, праца земляробская да душы ляжала. Шкада было старшыні калгаса губляць такога работніка: выпрасіў для яго гадавую адтэрміноўку ад армейскай службы.

### Глыбокае – Ташкент – Шынданд

Ваенкамат справу ведаў добра: свой падарунак Паўлу Макатуну ў выглядзе павесткі прызыўніку ўручыў якраз у дзень нараджэння хлопца 24 красавіка 1984 года.

Паколькі тады мы ўсе жылі на неабсягах Савецкага Саюза, дзіва не было, што беларус служыў на Каўказе, а грузін — у Расіі. І Павел не надаў значэння таму, што іх вязуць ў Ташкент. Сэрца ўстрывожылася, калі рабілі перасадку ў Маскве. Міма навабранцаў група ваенных пранесла цынкавую дамавіну. Груз памясцілі ў паштовы вагон. Адкуль ён прыйшоў, здагадацца было няцяжка.

– Некаму ж павёз цягнік гэту смяротную пасылку, — хлопец, як мог, адганяў чорныя думкі.

У Ташкенце навабранцаў расфарміравалі. Паўла меліся накіраваць у Алжыр, дзе на той час ішла лакальная вайна, але ў апошні момант сітуацыя "пераігралася": дарога павяла беларуса ў Афганістан, дзе гарачыя пяскі перамяшаюцца з яшчэ больш гарачым жаданнем выжыць.

Афган, пра які хлопец толькі тады-сяды чуў па радыё, сустрэў саракаградусным цяплом і сцюдзёнымі начамі. Па першасці Паўлу здавалася, што ён трапіў у вялікі музей пад адкрытым небам: усё было дзіўным і незвычайным. У адрозненне ад здаровых зрубаў-чатырохсценкаў, якія ставілі гаспадары ва Ураджайным, у афганскіх кішлаках паўсюдна – паўкруглыя глінабіткі. І нават пад дажджом, які ішоў тут па месяцу і больш, яны не размакалі. Афганскія сем'і былі людныя. Іншы раз радніліся да таго, што ў адным доме жылі па дзесяць-дванаццаць чалавек. Спалі на разасланых дыванах, якія днём прыбіраліся. Есці варылі ў вялікім казане. У беларусаў толькі турысты ды адпачываючыя на прыродзе такім карысталіся.

Днём кішлакі жылі звычайным жыццём. Гаспадары пасвілі на горных схілах авечак і коз, працавалі ў полі. Дзівам з дзіў было для Паўла тое, што сярод пяскоў, на распрацаваных лапіках, расла, як на радзіме, пшаніца. Сэрца ледзь не выскачыла ад радасці, калі аднойчы пачуў знаёмы гул трактара «Беларус». Здалося на момант, што дома, што зараз сядзе за руль і пацягнецца па полі свежаўзараная баразна....

Пачуццё дома знікала, калі вечарэла. Нібы сарокі ў поцемках стракаталі аўтаматы і кулямёты. За кожным вуглом таілася смерць і каб выжыць, выканаць воінскі абавязак, трэба было перамагчы страх.

Тэрміновую службу радавы Павел Макатун праходзіў у афганскім правінцыйным гарадку Шынданд, дзе дыслацыравалася асобная верталётная эскадрылля. Першыя армейскія навыкі ён набываў у роце аховы, затым быў стралком-радыстам верталётнага разліку. Тут, у Шындандзе сустрэў свайго земляка Віктара Міхмеля, з якім разам вучыўся ў Падсвіллі. І хоць служыў ён у другой воінскай часці, было адчуванне, што побач – родны брат.

Той вылет быў чарговым загадам, які трэба было выканаць. Дысанціраваўшы разведгрупу, верталёт узяў курс на базу. Раптоўна сярод горнай цясніны «разгаварыўся» кулямёт. Падбіты верталёт, які не паспеў набраць вышыню, рухнуў на скалы.

– Усё адбылося за лічаныя хвіліны, мы нават перапалохацца не паспелі. Гэта я цяпер разумею, што да смерці заставалася менш, чым паўкрока, – голас Паўла Кірылавіча задрыжаў. – Наш верталёт мог успыхнуць у небе вогненным факелам. Бог уратаваў: на базу вярнуліся жывыя...

Стракатым белапенным маем Павел Макатун вярнуўся ў роднае Ураджайнае. Будучы ў Афганістане, часта сніў вёску, дарагіх сэрцу людзей, а вярнуўся – сны запаланіла вайна. Чорнай птушкай, распластаўшы крылы, у снах лятаў «Чорны цюльпан», веснік смерці, які дастаўляў цынкавыя дамавіны; страляніна заглушала ўсё жывое; зноў і зноў бачыў, як падаў іхні падбіты верталёт…

Іншы раз крычаў у сне і прачынаўся ад жаху.

**Вясна на Паштовай вуліцы**

Сэрца Паўла шукала сваю палавінку. А тут у вёску прыехала маладая настаўніца. Дзяўчыну з Рудніцы пасля заканчэння пединстытута адправілі выкладаць матэматыку ва Ураджайнаўскай школе. Ногі ўсё часцей прыводзілі хлопца да дому, дзе яна жыла. Але шчасце, якое рана ці позна даецца кожнаму з нас, простым і лёгкім не бывае. Лёс разлучыў іх. Міраслава выйшла замуж, нарадзіла сына. Ён і Яна жылі ў адной вёсцы, выпадкова сустракаліся. Праз нейкі час жанчына аўдавела. Ужо сем год, як Павел і Міраслава жывуць разам у доме на Паштовай вуліцы.

Яна – па-ранейшаму вучыць дзяцей матэматыцы, а дома – гаспадыня, жонка і надзейны банк, якому Павел давярае і асноўны зароблены капітал і працэнты, якія, умеючы, з яго можна нажыць.

Павел і сам гаспадар старанны: працаваць не лянуецца, цяжкасцей не баіцца. Шаснаццаць год быў трактарыстам, дзесяць – лесніком. З красавіка мінулага года працуе трактарыстам у філіяле РВУ «Докшыцырайгаз». На навёханькім магутным «Беларусе» са спаранымі калёсамі, як на танку, калясіць па балоце, на якім ідзе здабыча торфу.

– Я сваім жыццём і працай задаволены. Рукі маю, тэхніку люблю, без працы жыцця не ўяўляю і ведаю, што і сябе, і сям'ю прагадую. Недарэмна ж мудрыя людзі казалі: праца ўсходзіць на руках мазалём, а ў кішэні – рублём. Стараюся, заробкі добрыя, над галавой неба мірнае – ці ж гэта не шчасце? А людзі, якія жаляцца на цяжкае жыццё, ніколі не былі на вайне і не ведаюць, што такое сапраўдны цяжар, – кажа Павел Кірылавіч.

Ціхае вясковае, простае чалавечае шчасце былы воін-афганец Павел Кірылавіч Макатун знайшоў на сваёй маленькай радзіме, у роднай вёсцы, на вуліцы Паштовай, куды штогод па Божай волі прыходзіць прыгажуня-вясна. Вясна на Паштовай вуліцы.

**Галіна СУТУЛА**